*С.В.ЗЫГМАНТОВІЧ*

# ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ: КАМПЕТЭНТНАСНЫ ПАДЫХОД

У працэсе рэфармавання сістэмы вышэйшай прафесійнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь актуалізуецца праблема перагляду падыходаў, зместу, тэхналогій падрыхтоўкі спецыялістаў для розных сфер дзейнасці. У якасці аднаго з такіх падыходаў прапануецца выкарыстоўваць кампетэнтнасны падыход.

Аналіз шэрага даследаванняў, праграмных дакументаў па развіцці сістэмы адукацыі паказвае, што сярод сучасных патрабаванняў да падрыхтоўкі выпускніка ВНУ галоўным выступае сфарміраванасць у яго living разнабаковай кампетэнтнасці.

Традыцыйна мэты вышэйшай прафесійнай адукацыі вызначаліся наборам ведаў, уменняў, навыкаў, якімі павінен валодаць выпускнік. Сёння такі падыход аказаўся недастатковым. Соцыуму, работадаўцу, вытворчасці патрэбныя выпускнікі, гатовыя да ўключэння ў далейшую жыццядзейнасць, здольныя эфектыўна вырашаць узніклыя перад імі жыццёвыя і прафесійныя праблемы. А гэта ў многім залежыць як ад атрыманых ведаў, уменняў, навыкаў, так і ад пэўных якасцей, для азначэння якіх ужываюцца паняцці “кампетэнцыя” і “кампетэнтнасць”.

Кампетэнтнасны падыход патрабуе вызначэння таго, што выпускнік можа рабіць, якім спосабам дзейнасці ён авалодаў, да чаго ён гатовы, падрыхтаваны. Кампетэнтнасны падыход азначае паступовую пераарыентацыю дамінуючай адукацыйнай парадыгмы з пераважнай трансляцыяй ведаў, фарміраваннем навыкаў на стварэнне ўмоў для авалодання комплексам разнабаковай кампетэнцыі, які ўлічвае патэнцыял, здольнасці выпускніка да ўстойлівай жыццядзейнасці ва ўмовах сучаснай шматфактарнай сацыяльна-палітычнай, рынкава-эканамічнай, інфармацыйна і камунікацыйна насычанай прасторы. Сам па сабе факт размовы аб кампетэнцыі ў спалучэнні з ведамі, уменнямі, навыкамі – сведчанне таго, што веды перасталі быць “сімвалічным капіталам”. Наяўнасць ведаў не вызначае прасторы жыццёвага шляху, не вызначае перспектывы. Змяніліся і сацыяльныя акцэнты. Калі ў 60-я гг. мінулага стагоддзя не ўзнікала пытанняў адносна каштоўнасці інтэлекту, то зараз сітуацыя змянілася. Зараз інтэлект каштоўны не як самамэта, а як адзіны і ўсеагульны сродак вырошчвання самастойнасці.

Сёння ў педагагічнай тэорыі не існуе адзінага азначэння паняццяў “кампетэнцыя” і “кампетэнтнасць”. Паняцце “кампетэнцыя” часцей ужываецца для азначэння адукацыйнага выніку, які выяўляецца ў падрыхтаванасці, здольнасці выпускніка, у рэальным валоданні метадамі, сродкамі дзейнасці, у магчымасці справіцца з пастаўленымі задачамі; такой формы спалучэння ведаў, уменняў і навыкаў, якая дазваляе ставіць і дасягаць мэты па пераўтварэнні навакольнага асяроддзя.

Кампетэнтнасць – гэта валоданне чалавекам адпаведнай кампетэнцыяй. Пад кампетэнтнасцю звычайна разумеюць інтэгральную якасць асобы, якая праяўляецца ў агульнай здольнасці і гатоўнасці яе да дзейнасці, заснаванай на ведах і вопыце, набытых у працэсе навучання і сацыялізацыі і арыентаваных на самастойны і паспяховы ўдзел у дзейнасці.

Такім чынам, кампетэнцыя разглядаецца як складаная сацыяльна дыдактычная асобасная структура, заснаваная на каштоўнасцях, накіраванасці, ведах, вопыце, набытых асобай як у працэсе навучання, так і па-за гэтым працэсам. Яна выяўляецца ў мабілізацыі асобай атрыманых ведаў, вопыту, паводзін у канкрэтнай сітуацыі для вырашэння разнастайных задач. Кампетэнцыя прадвызначае сфарміраванасць у асобы ўнутранай матывацыі, псіхалагічнай і практычнай гатоўнасці да дасягнення як мага больш якасных вынікаў у сваёй прафесійнай дзейнасці, сацыяльным жыцці.

Паняцці кампетэнцыі і кампетэнтнасці сістэмныя, шматкампанентныя. Яны характарызуюць пэўнае кола працэсаў, рэалізуюцца на розных узроўнях, г.зн. уключаюць розныя разумовыя аперацыі (аналітычныя, крытычныя, камунікатыўныя), а таксама практычныя ўменні і маюць сваю класіфікацыю і іерархію. Змястоўны аспект тэрміна “кампетэнцыя” ўключае тры складаючых: кагнітыўную (валоданне ведамі); аперацыйную (сфарміраванасць спосабаў дзейнасці, тэхналагічная пісьменнасць); аксіялагічную (засваенне каштоўнасцей, каштоўнасныя адносіны да прафесійнай дзейнасці і асабістага росту). Такі пункт гледжання на сутнасць кампетэнцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераважае ў работах расійскіх і беларускіх даследчыкаў (В.А.Болатаў, А.В.Хутарской, В.В.Краеўскі, А.А.Пінскі, І.А.Зімняя, І.Д.Фрумін, В.С.Таізава, В.Л.Жук, У.І.Васкрасенскі, А.І.Жук, А.У.Макараў і інш.).

Існуюць розныя падыходы да класіфікацыі кампетэнтнасці, розныя схемы, напаўняльнасць, трактоўка. Джон Равен пабудаваў мадэль агульнай кампетэнтнасці, якая ўяўляе сабой матрыцу са 143 элементаў, але такі аб’ём робіць яе выкарыстанне практычна немагчымым [6]. Адзін з найбольш шматаспектных відаў класіфікацыі кампетэнтнасці прапанаваны доктарам педагагічных навук Германам Селяўко. Тут у аснове класіфікацыі ляжаць такія прыметы, як ключавая суперкампетэтнасць, віды дзейнасці, сферы грамадскага жыцця, галіны ведаў, галіны грамадскай вытворчасці, складаючыя псіхалагічнай сферы, здольнасці, ступені сацыяльнага развіцця і статусу [7].

Пры разглядзе магчымасцей кампетэнтнаснага падыходу ў падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў ва ўмовах ВНУ нас цікавіць класіфікацыя кампетэнцыі ў прафесійнай сферы.

Паняцце “прафесійная кампетэнтнасць” у педагагічнай навуцы вызначаецца рознымі аўтарамі па-рознаму, у прыватнасці як:

– сукупнасць ведаў і ўменняў, што вызначаюць выніковасць працы;

– аб’ём навыкаў выканання задачы;

– камбінацыя асабістых якасцей і ўласцівасцей, комплекс ведаў і прафесійна значных асобасных якасцей;

– вектар прафесіяналізацыі;

– адзінства тэарэтычнай і практычнай гатоўнасці да працы, здольнасці ажыццяўляць культураадпаведныя віды дзеянняў і інш. Разнастайнасць і разнапланавасць трактовак паняцця “прафесійная кампетэнтнасць” абумоўлены выкарыстаннем розных навуковых падыходаў да вырашаемых даследчыкамі навуковых задач: асобасна-дзейнаснага, сістэмна-структурнага, ведаўнага, культуралагічнага і інш. У рамках жа кампетэнтнаснага падыходу з улікам змястоўнай напаўняльнасці асноўных паняццяў прапануецца пад прафесійнай кампетэнцыяй разумець адзінства ведаў, уменняў, здольнасцей і гатоўнасці асобы дзейнічаць у пэўнай сітуацыі і вырашаць прафесійныя задачы з высокім узроўнем нявызначанасці; здольнасць і гатоўнасць да дасягнення больш якаснага выніку працы; адносіны да прафесіі як каштоўнасці [2; 3].

У адукацыйнай практыцы пакуль не існуе адзінага падыходу да вызначэння кампетэнцыі выпускніка ВНУ, яе аперацыяналізацыі. Поруч з тэрмінам “кампетэнцыя” (“прафесійная кампетэнцыя”) існуе тэрмін “ключавая кампетэнцыя”. У большасці публікацый “ключавая прафесійная кампетэнцыя” разглядаецца як базавая, універсальная кампетэнцыя, агульная для ўсіх прафесій і спецыяльнасцей, якую можна выкарыстоўваць у самых розных сітуацыях.

І.А.Зімняя вылучае тры вялікія класы ключавой кампетэнцыі: кампетэнцыя, якая адносіцца да самого чалавека як асобы, суб’екта дзейнасці, зносін; кампетэнцыя, што адносіцца да сацыяльнага ўзаемадзеяння чалавека і сацыяльнай сферы; кампетэнцыя, якая адносіцца да дзейнасці чалавека [4]. М.Стобарт, намеснік дырэктара Дэпартамента адукацыі, культуры і спорту Савета Еўропы, вылучае пяць груп кампетэнцыі, авалоданне якімі і выступае асноўным крытэрыем якасці адукацыі: палітычная і сацыяльная кампетэнцыя; кампетэнцыя, якая тычыцца жыцця ў шматкультурным грамадстве; кампетэнцыя, якая вызначае валоданне вуснымі і пісьмовымі зносінамі; кампетэнцыя, звязаная з узнікненнем грамадства інфармацыі; кампетэнцыя, што рэалізуе здольнасць і жаданне вучыцца ўсё жыццё.

В.Л.Жук, загадчык кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ, вылучае два віды кампетэнцыі выпускніка ВНУ: спецыяльную і ключавую. Апошняя ў сваю чаргу падзяляецца на сацыяльную, прафесійную, камунікатыўную, інфармацыйную, адукацыйную [2; 3].

Рэалізацыя сучасных патрабаванняў да прафесійнай падрыхтоўкі выпускнікоў ВНУ прадугледжвае дасягненне інтэграванага канчатковага выніку адукацыі, у якасці якога можна разглядаць сфарміраванасць у выпускніка ключавой кампетэнцыі як адзінства абагульненых ведаў і ўменняў, універсальных здольнасцей і гатоўнасці да вырашэння вялікіх груп задач – ад асабістых да сацыяльных і прафесійных, і спецыяльнай прафесійнай кампетэнцыі, якая вызначае валоданне ўласна прафесійнай дзейнасцю на дастаткова высокім узроўні, гатоўнасць да інавацый у прафесійнай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, выкарыстанне кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў прадугледжвае асэнсаванне ўсімі суб'ектамі адукацыйнага працэсу канчатковай мэты сваёй дзейнасці – падрыхтоўку спецыяліста, што валодае як ключавой, так і спецыяльнай прафесійнай кампетэнцыяй, здольнага вырашаць разнастайныя задачы бібліятэчна-бібліяграфічнай практыкі, гатовага да інавацыйнай дзейнасці ў бібліятэчнай сферы, маючага высокую матывацыйную накіраванасць на высокапрадукцыйную працу менавіта ў бібліятэчнай сферы. Такі спецыяліст усведамляе грамадскую значнасць самой прафесіі і сваю ролю ў рэалізацыі сацыяльных функцый бібліятэкі.

Выкарыстанне разглядаемага падыходу таксама патрабуе ацэнкі патэнцыялу, вопыту работы ў падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў, яго крытычнага аналізу, распрацоўкі адпаведнай нарматыўнай і вучэбна-метадычнай базы, перагляду зместу, тэхналогіі і методыкі падрыхтоўкі будучых бібліятэкараў з улікам арыентацыі на новы адукацыйны вынік.

Аналіз сучаснай практыкі падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў дазваляе зрабіць вывад, што кампетэнтнасны падыход не з'яўляецца для нас абсалютна наватарскім. Элементы гэтага падыходу актыўна выкарыстоўваюцца ў вучэбна-выхаваўчым працэсе на факультэце.

Фарміраванне ключавой і спецыяльнай прафесійнай кампетэнцыі будучых бібліятэчных работнікаў патрабуе інтэгратыўнага падыходу і рэалізуецца падчас вучэбна-выхаваўчага працэсу, у якім нельга жорстка вызначыць канкрэтныя дысцыпліны або віды дзейнасці "адказнымі" за вырашэнне вучэбных задач. Разам з тым відавочна роля розных груп дысцыплін. Так, сацыяльна-гуманітарным і агульнанавуковым дысцыплінам (першы і другі блокі вучэбнага плана) належыць прыярытэтная роля ў фарміраванні сацыяльнай, камунікатыўнай кампетэнцыі, кампетэнцыі ў сферы пазнавальнай дзейнасці, у развіцці інтэлектуальнай дапытлівасці, у "навучанні жыццю" праз агульнае развіццё, творчасць, маральна-эстэтычную падрыхтоўку і інш.

Прэрагатывай пераважна спецыяльных дысцыплін з'яўляецца задача фарміравання кампетэнцыі ў сферы працоўнай дзейнасці. Пры падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў у вучэбным плане выдзяляюцца агульнапрафесійныя, спецыяльныя дысцыпліны і дысцыпліны спецыялізацый. Вывучэнне агульнапрафесійных дысцыплін ("Бібліяграфазнаўства. Тэорыя і гісторыя", "Гісторыя беларускай бібліяграфіі", "Сацыяльныя камунікацыі" і інш.) забяспечвае, перш-наперш, фундаментальную падрыхтоўку ў асноўнай і сумежных галінах, ствapae рэзерв ведаў, які дазваляе адаптавацца да змен. Развіццё інтэлекту, яго сацыяльнай і практычнай накіраванасці, абстрактна-лагічных якасцей, рацыянальнасці і крытычнасці мыслення, авалоданне метадалогіяй пазнання ў прафесійнай сферы – такі далёка не поўны пералік развіваючага патэнцыялу спецыяльных дысцыплін агульнанавуковага цыкла.

Спецыяльныя дысцыпліны ("Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы", галіновыя бібліяграфічныя курсы, "Фонды бібліятэк", "Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг" і інш.) накіраваны на развіццё прафесійных уменняў і навыкаў па выкананні канкрэтных вытворчых функцый. Хаця адпаведны прафесійны ўзровень фарміруецца на працягу ўсёй прафесійнай дзейнасці, ужо ў студэнцкія гады закладваюцца асновы таго, што называецца "навучыцца рабіць", г.зн. пэўны ўзровень майстэрства ў вырашэнні прафесійных задач, творчасць у нестандартных сітуацыях, пошук нестандартных і эфектыўных рашэнняў. На гэта накіраваны пастаяннае аднаўленне зместу спецыяльных дысцыплін, імкненне, акрамя прадметных ведаў, раскрыць для студэнтаў працэс іх атрымання (гісторыка-метадалагічны аспект спецыяльных ведаў), прадастаўленне магчымасці студэнтам сістэмнага, поўнага засваення ўсіх бібліятэчных цыклаў, абгрунтаванне рацыянальнасці розных метадычных прыёмаў, сродкаў дзейнасці, знаёмства з вопытам бібліятэк замежных краін шляхам параўнальнага аналізу, з лепшымі ўзорамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, новымі тэхналогіямі і інш.

Актыўна развіваючы характар выкладання спецыяльных дысцыплін знаходзіць адлюстраванне як у змесце, так і ў формах навучання. Акрамя лекцый, семінарскіх, традыцыйных лабараторных і практычных заняткаў, усё больш выкарыстоўваюцца ў практыцы выкладання спецыяльных дысцыплін такія актыўныя формы, як ролевыя і дзелавыя гульні, трэнінгі, рашэнне вытворчых сітуацый, дыялогава-дыскусійныя метады, навучанне ў парах, падрыхтоўка мерапрыемстваў для канкрэтнай мэтавай групы карыстальнікаў, метады "кейсаў", індывідуальныя заданні і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прычым часта заданні, якія прапануюцца студэнтам і выконваюцца імі, выкарыстоўваюцца затым у навучальным працэсе. У якасці іх могуць быць заказы бібліятэк. Магчымасці грамадскага прызнання вынікаў практычных заданняў студэнтаў значна ўзрастаюць у рамках функцыянавання вучэбна-вытворча-навуковага комплексу “БДУ культуры і мастацтваў – Нацыянальная бібліятэка Беларусі”, палажэнне аб стварэнні якога падрыхтавана на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый.

Выкарыстанне названых формаў у навучальным працэсе пасуецца з патрабаваннямі кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі кадраў, паколькі формы накіраваны на набыццё вопыту вырашэння разнастайных задач і выкананне сацыяльна-прафесійных функцый на аснове сфарміраваных абагульненых ведаў, універсальных здольнасцей і відаў гатоўнасці, якія адносяцца да розных сфер жыццядзейнасці чалавека, кірункаў прафесійнай дзейнасці. Гэтыя формы, што вельмі немалаважна для фарміравання аксіялагічнай складаючай прафесійнай кампетэнтнасці, прадугледжваюць таксама развіццё эмацыянальнай сферы будучых спецыялістаў (задаволенасць ад выкананага задання, пачуццё прафесійнай годнасці, упэўненасць у сабе, пазітыўныя адносіны да сваіх сакурснікаў, будучай прафесійнай дзейнасці, навакольнаму свету, матывацыя далейшай самаактуалізацыі і самаўдасканалення).

Павелічэнне колькасці гадзін на самастойную работу студэнтаў (сёння яна складае ад 20 да 40% агульнай колькасці гадзін па асобных дысцыплінах), арганізацыйнае, вучэбна-метадычнае яе забеспячэнне, разнастайнасць прапануемых выкладчыкамі формаў самастойнай работы і формаў яе кантролю стымулююць фарміраванне як інфармацыйнай, так і адукацыйнай кампетэнцыі будучых спецыялістаў.

На факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў укараняюцца сістэма кантрольна-тэставых заданняў, рэйтынгавая сістэма ацэнкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, якія дазваляюць ажыццяўляць пастаянны кантроль за працэсам засваення зместу выкладаемых дысцыплін, а не толькі яго вынікаў на заліках і экзаменах. Акрамя таго, гэта мае і значны выхаваўчы эфект, таму што садзейнічае выкарыстанню метаду спаборніцтва, вызначэнню лепшых, укараненню і адпаведна ацэньванню выканання заданняў рознай ступені складанасці, стымуляванню навуковай дзейнасці студэнтаў, фарміраванню лідэраў бібліятэчнай справы.

Актуальнай праблемай, якой надаецца значная ўвага на факультэце і якая займае значнае месца ў змесце прафесійнай кампетэнцыі, з’яўляецца фарміраванне прафесійнага мыслення, прафесійнай накіраванасці асобы будучага спецыяліста**,** у структуры якой узаемазвязаны інтарэсы і схільнасці да будучай прафесійнай дзейнасці як стартавая аснова далейшага развіцця прафесійных здольнасцей, станоўчыя матывы выбару і атрымання прафесіі і жаданне, намеры працаваць па спецыяльнасці. Як паказалі вынікі сацыялагічных даследаванняў, для студэнтаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый характэрны даволі нізкі ўзровень матывацыі выбару будучай прафесіі. Не спрыяе вызначэнню прафесійнай арыентаванасці і адсутнасць адбору сярод абітурыентаў у час прыёму на факультэт. Таму менавіта на выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін ускладаюцца задачы не толькі навучання студэнтаў, але і фарміравання каштоўнасна-этычнай складаючай кампаненты прафесійнай кампетэнцыі. І ў гэтым плане выкладчыкамі спецыяльных дысцыплін шмат чаго робіцца: студэнты рыхтуюць падчас вучэбных заняткаў эсэ на тэму “Я і мая будучая прафесія”; рэкламныя матэрыялы ў дапамогу прафарыентацыйнай дзейнасці бібліятэк; праводзяць круглыя сталы, дні прафесійных зносін, дні спецыяліста на тэмы “Этыка бібліятэкара”, “Імідж бібліятэкара”, “Сацыяльны статус бібліятэкара”; сустрэчы з прафесіяналамі бібліятэчнай сферы, выпускнікамі факультэта і інш.

У вырашэнні задач прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў значнае месца належыць вытворчай практыцы. Яна выконвае функцыю сувязнога звяна паміж падрыхтоўкай студэнтаў у ВНУ і іх будучай самастойнай работай. Авалоданне разнастайнымі кірункамі бібліятэчнай дзейнасці і фарміраванне гатоўнасці да яе магчымыя пры ўзаемапранікненні і ўзаемаабумоўленасці тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі будучага бібліятэкара. Ні адзін кампанент прафесійнай дзейнасці і гатоўнасці да яе немагчыма сфарміраваць толькі ў вучэбных аўдыторыях. Гэта магчыма зрабіць у працэсе непасрэдных зносін з карыстальнікамі бібліятэкі, бібліятэчнымі супрацоўнікамі, у працэсе рэальнага вырашэння ўзніклых вытворчых задач. Таму на факультэце надаецца шмат увагі арганізацыі вытворчай практыкі: распрацавана канцэпцыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбнай і вытворчай практыкі на працягу ўсяго тэрміну навучання студэнтаў; скразная праграма практыкі дыферэнцыравана па курсах і з улікам спецыялізацый, па якіх рыхтуюцца будучыя спецыялісты бібліятэчнай справы; у якасці баз практыкі вызначаюцца вядучыя бібліятэкі краіны; праграмы і вынікі практыкі абмяркоўваюцца сумесна з кіраўнікамі бібліятэк. Вынікі практыкі для кожнага студэнта – гэта не толькі набыццё вопыту рэалізацыі разнастайных сацыяльна-прафесійных функцый, але і вызначэнне сваёй прафесійнай прыгоднасці, магчымасць вызначыць для сябе той кірунак дзейнасці ў бібліятэцы, які найбольш адпавядае ўласным здольнасцям, схільнасцям, дасць большую магчымасць для самарэалізацыі.

Кампетэнтнасны падыход прадугледжвае ўзрастанне значэння практыкі для арыентаванай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Па гэтай прычыне магчыма запазычванне вопыту некаторых краін свету, дзе ацэнка, атрыманая за практыку, раўназначна ацэнцы на выпускным экзамене.

Разам з тым, нягледзячы на пэўныя спробы пераарыентацыі выкладання спецыяльных дысцыплін і сведчанне таго, што кампетэнтнасны падыход да- статкова гарманічна спалучаецца з традыцыйнай інструментальна-педага-гічнай трыядай “веды – уменні – навыкі”, яшчэ ў нашай рабоце недахопаў нямала:

– выкладанне цыкла спецыяльных дысцыплін у значнай меры пакуль грунтуецца на інфармацыйна-ведавым і прадметна-цэнтраваным падыходах;

– пераважае прадметная архітэктоніка над міжпрадметнай у распрацоўцы вучэбных планаў;

– спецыяльныя дысцыпліны, у большасці сваёй маючы канкрэтны характар, арыентаваны на фарміраванне прафесійных уменняў і навыкаў, а не на фарміраванне асноўных складаючых прафесійнай кампетэнцыі;

– фармальна студэнт прызнаецца суб’ектам адукацыйнай дзейнасці, але ў той жа час захоўваецца ў асноўным папярэдняя логіка навучання, разлічаная на пасіўнага аб’екта, калі выкладчык з’яўляецца асноўнай крыніцай і інтэрпрэтатарам ведаў;

– існуе супярэчнасць паміж павелічэннем часу на самастойную работу студэнтаў і загружанасцю выкладчыка, нерацыянальнай, ненарміраванай колькасцю гадзін, якія выдзяляюцца на кантроль за самастойнай работай студэнтаў.

На ліквідацыю ўказаных недахопаў павінен быць накіраваны ўвесь вучэбна-выхаваўчы патэнцыял універсітэта. Іх устараненне бачыцца нам у:

– тэарэтычным асэнсаванні праблем фарміравання прафесійнай кампетэнцыі будучых бібліятэчных кадраў (мэт, задач, зместу, тэхналогіі, ацэнкі вынікаў і інш.);

– распрацоўцы адукацыйных стандартаў новага пакалення з улікам пераходу на двухступеньчатую сістэму падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў з арыентацыяй на кампетэнтнасны падыход да навучання і выхавання выпускнікоў;

– пабудове ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу з улікам дасягненняў галоўнага выніку – падрыхтоўкі спецыяліста з высокім узроўнем прафесійнай кампетэнтнасці;

– пераходзе кожнага выкладчыка ад перадачы прафесійна значнай інфармацыі да кіравання самастойнай вучэбна-пазнавальнай і прафесійна-практычнай дзейнасцю навучэнцаў, асэнсавання сваёй ролі ў станаўленні новай генерацыі спецыялістаў;

– пераарыентацыі на развіццё асобы будучага бібліятэкара, змене суб’ектна-аб’ектных адносін на суб’ектна-суб’ектныя, стварэнні мадэлі будучага спецыяліста як сукупнасці асабістых і прафесійных якасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Болотов В.А., Сериков В.В.* Компетентносная модель: от идеи к образовательной парадигме // Педагогика. – 2003. – № 10. – С.9–14.

2. *Жук О.Л.* Компетентносный подход в высшем профессиональном образовании // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 12. – С.41–48.

3. *Жук О.Л.* Психолого-педагогическая компетентность выпускника университета // Вышэйшая школа. – 2004. – № 6. – С.45–51.

4. *Зимняя И.А.* Ключевые компетенции – новая парадигма результата образования // Высшее образование. – 2003. – № 5. – С.34–42.

5. *Макаров А.В.* Компетентносная модель социально-гуманитарной подготовки выпускника вуза // Вышэйшая школа. – 2004. – № 1. – С.16–21.

6. *Равен Дж.* Педагогическое тестирование. Проблемы, заблуждения, перспективы / Пер. с англ. – М.: Когито-Центр, 2001. – 139 с.

7. *Селевко Г.* Компетентности и их классификация // Народное образование. – 2004. – № 4. – С.138–143.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ